# Лічбы на сэрцы

## Векавы юбілей Міхаіла Савіцкага

**Народны мастак СССР і Беларусі, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Расійскай акадэміі мастацтваў, Герой Беларусі Міхаіл Андрэевіч Савіцкі прайшоў, здаецца, усе кругі нацысцкага пекла. У 1940-м ён быў прызваны ў Чырвоную армію. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у 250-дзённай абароне Севастопаля, там трапіў у палон. У 1942–1945 гадах быў вязнем 326 шталага, лагера ваеннапалонных у Дзюсельдорфе, канцэнтрацыйных лагераў Бухенвальд, Мітэльбаў-Дора, Дахау.**
**Яго карціны цыкла «Лічбы на сэрцы» не сведчаць, не гавораць, а крычаць аб тым, што было і што не павінна паўтарыцца ніколі. Гэтыя работы ўражваюць, ашаламляюць, хвалююць да глыбіні душы. Савіцкі выжыў… выпадкова: мастакі ў канцлагеры падлягалі знішчэнню ў першую чаргу. Як самыя небяспечныя сведкі.**

Мне пашанцавала на працягу амаль двух дзесяцігоддзяў быць у цесным кантакце з Міхаілам Савіцкім – у журналісцкім і чыста чалавечым. Падрыхтавала шмат інтэрв'ю з ім для газеты «Звязда», дзе працавала доўгі час. А колькі звычайных (незвычайных!), «будзённых» гутарак было!

Размовы з Міхаілам Андрэевічам пра мастацтва і жыццё, пра лёс і час, вайну і здраду, ахвярнасць і патрыятызм не толькі цікавыя, але часам нават парадаксальныя. Мастаку падабаліся ў тым ліку каверзныя, не надта прыемныя пытанні – ён абураўся, выходзіў з сябе. І гэта давала яму дадатковы палемічны тонус.

Ён з цікавасцю знаёміўся з маёй кандыдацкай дысертацыяй. Даваў парады, штосьці рэкамендаваў, прапаноўваў… Водгук на аўтарэферат напісаў на бланку Творчых акадэмічных майстэрняў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, дзе з 1980 года кіраваў майстэрняй жывапісу. Дзякуючы Савіцкаму ў працэсе шматлікіх гутарак пра сапраўдныя і ўяўныя каштоўнасці, нацыянальную спадчыну, спрадвечную культуру беларускага народа нарадзілася ідэя і доктарскай дысертацыі «Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі».

Міхаіл Андрэевіч пайшоў з жыцця 8 лістапада 2010-га. А незадоўга да смерці, летам 2009 года, я кожныя выхадныя ездзіла да яго ў майстэрню: запісвала мемуары. Гэта былі не толькі ўспаміны чалавека, які прайшоў вялікае жыццё, але і падрабязна дэталізаваныя тлумачэнні поглядаў на жыццё і творчасць мастака-філосафа. Дый, прынамсі, іншым сапраўдны Майстар быць не можа.



Міхаіл Савіцкі. Сярэдзіна 2000-х

Звычайна гутарылі па 3–4 гадзіны, потым тыдзень амаль са стэнаграфічнай хуткасцю перакладала дыктафонныя дыялогі на паперу. Мікракасеты на той час было не дастаць, адкладваць запісы на потым не выпадала: праца ў штодзённай газеце вымагала пастаяннага збору новай інфармацыі «пад дыктафон». Вось і спяшалася, як кажуць журналісты, здымаць тэкст – каб на наступныя выхадныя запісваць наноў…

Фрагменты дыялогаў з Міхаілам Савіцкім розных гадоў – своеасаблівы партрэт народнага Мастака.

## Вязень 32815

**– Міхаіл Андрэевіч, вы такі ўдачлівы чалавек…**

– Я?! Жартуеце?

**– Вы засталіся жывым у вайну, і потым…**

– Выжыў… Праўда, бачыў свой шкілет – уласнымі вачыма.

**– Як?..**

– Глядзеў на сябе – і бачыў.

**– Тое, што потым у «Аўтапартрэце» ўбачылі ўсе?**

– Ну, у «Аўтапартрэце» я ўжо рабіў чалавека. А ў канцлагеры я быў шкілетам, які трэба было падняць і перанесці: у самога не было моцы рухацца.

**– Жыццё вісела на валаску?**

– Так… Калі амерыканцы вызвалялі Дахау 29 красавіка 1945 года, я знаходзіўся ў 30-м бараку – за ўсё існаванне лагера жывым адтуль ніхто не выйшаў…

**– Мінулае лагерніка – цяжкі груз, але як удалося прабіцца?**

– Бернард Шоу сказаў: «Працуйце, усё астатняе прыйдзе само».

**– Што найчасцей успамінаецца з вайны?**

– Вайна – гэта цяжкая работа, што ўспамінаць?.. Лом, кірка – трэба дзяўбці скальны грунт. І страляць. Часам у штыкавую атаку хадзілі, часам – у атаку з камянямі пры абароне Херсанескага маяка.

**– З камянямі – на танкі?**

– Ну, былі і танкі…

**– Як вы трапілі ў палон?**

– Гэта зусім нецікава… Праз чацвёра сутак пасля здачы Севастопаля, калі ў нас ужо не было боепрыпасаў і мы біліся з немцамі камянямі, тады і трапіў у палон.

**– Вы прайшлі праз страшэнныя жорны гітлераўскіх канцлагераў Бухенвальд, Мітэльбау-Дора, Дахау. Тады, у тым пекле, верылася, што перамога будзе за намі?**

– Ніколі, нават калі я губляў прытомнасць, – ніколі не прыходзіла ў галаву, што немцаў не разаб'юць, што пераможа Германія. Абсалютная была ўпэўненасць, што перамога будзе за намі.

**– Вы малявалі ў канцлагеры?**

– Здаралася… Вельмі сябраваў з французамі. Размаўлялі на руска-французска-нямецкай мове. Яны вучылі рускія словы, я – французскія, разам – нямецкія. Разумелі адно аднаго. У іх было шмат пытанняў аб нашай краіне, і я па памяці многае ім маляваў. Яны хацелі ведаць, які Сталін, – і я маляваў Сталіна. Яны чулі пра Варашылава – таксама маляваў. Гэтыя малюначкі яны ў мяне забіралі.

**– Вы часта бываеце за мяжой?**

– За ўсё жыццё быў два разы. Першы – калі трапіў у палон у Севастопалі і апынуўся ў Германіі, у канцлагерах. Другі раз – з'ездзіў у Балгарыю з персанальнай выстаўкай. Больш за мяжою не быў.

**– Чаму?**

– Шкада часу. Аднойчы мяне запрасілі ў ГДР (Германская Дэмакратычная Рэспубліка. – *Аўт.*), вельмі прыемная была прапанова. А я тады якраз над серыяй «Лічбы на сэрцы» працаваў. Падумаў-падумаў і… адмовіўся ад замежжа, замест мяне паехалі калегі. Адметна, што ў дзень, калі яны ад'язджалі, я на чыстым палатне пачаў пісаць работу «Спяваючыя камуністы». А калі яе закончыў, памятаю, выйшаў з майстэрні і сустрэў калег, якія прыехалі з Германіі. Падумаў: мабыць, правільна зрабіў, што не паехаў.

**– Вы ніколі не былі членам КПСС, але гэта работа – гімн не толькі свабодзе, а і камуністам?**

– Я разглядаю карціну як гімн мужнасці і веры, вернасці сваім перакананням. Гэта якасць – вернасць –

**Вязень 32815 (цыкл «Лічбы на сэрцы»). 1976 год**



па-мойму, неабходна ўсім людзям… Заўсёды імкнуся пісаць жыццё такім, якое яно ёсць, а не тое, што ўяўляецца палітыкам. Я стараўся рабіць гэта і пры сацыялістычным ладзе – пісаў вайну такой, якой яна была: велізарнай трагедыяй, бядой для народа, а не ўсёпераможным геройствам, як патрабавала партнаменклатура… Найвышэйшы стан патрыятызму ў карціне – калі партызаны хаваюць сваіх дзяцей.

**– Патрыятызму? Ці трагізму?**

– Гэта не толькі трагізм, але і найвышэйшая праява патрыятызму, любові да Радзімы – калі чалавек ахвяруе дзіцём. Народная трагедыя, аднак такім было жыццё.

## Вытокі

Колькі сябе памятаў, ён заўсёды марыў стаць мастаком. Але ў вёсцы Звянячы Талачынскага раёна, дзе нарадзіўся 18 лютага 1922 года, не было ніякіх кніг па мастацтву. Прызнаваўся: «Тады наогул уяўлення не меў, што ёсць такая вялікая, складаная галіна чалавечай дзейнасці – мастацтва. Здавалася, мастак малюе, а я люблю маляваць».

Гадаваўся на народнай творчасці, убіраў у сябе па кропельцы і прапускаў праз душу спрадвечныя традыцыі – гэта яго галоўная мастакоўская школа. Потым былі Мінскае мастацкае вучылішча, Мастацкі інстытут імя Сурыкава ў Маскве, вывучэнне азоў і «вышэйшай матэматыкі» жывапісу. Чыстыя вытокі, спасцігнутыя ў дзяцінстве, сілкавалі творчасць Савіцкага заўсёды.

Ён нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Маці Ганна Канстанцінаўна працавала калгасным пчаляром, была слыннай майстрыхай, прыдумвала цудоўныя арнаменты. Бацька Андрэй Пятровіч працаваў рамонтнікам на чыгунцы, быў і цесляром выдатным, і кавалём, і рэзчыкам па дрэве.

З дзяцінства Савіцкі вызначаўся выключнай (мастакоўскай!) памяццю, ведаў велізарную колькасць вершаў. На калгасных сходах дэкламаваў Пушкіна, вялікія ўрыўкі з «Новай зямлі» Якуба Коласа. Удзельнічаў у самадзейных канцэртах: дакладна запамінаў паказаны на імгненне аркушык з разнастайнымі знакамі, лічбамі, мог усё адразу ж узнавіць у памяці.

– Быў такім шабутным хлопцам! – расказваў Міхаіл Андрэевіч. – Мне ўсё было цікава. За што б ні браўся – шчыра выкладваўся. Я такім шабутным яшчэ ў Германіі быў. У лагеры ваеннапалонных, да канцлагера, займаўся ювелірнай справай, рабіў пярсцёнкі з хроманікелевага сплаву – адбою не было. Разлічваліся немцы прадуктамі, ежы хапала многім ваеннапалонным…

Знешне Савіцкі быў зусім не падобны да мастака: ніякага намёку на прыналежнасць да творчага цэху жывапісцаў. Сціплы, строгі чалавек, далёкі ад багемнага туману, ад вытанчана-мудрагелістых манер. Ніякага антуражу нават у вопратцы. Просты самавязаны світар, чорныя джынсы і… валёнкі. Так апранаюцца звычайна вясковыя мужчыны сталага веку – каб было зручна працаваць. Ён увогуле не любіў гучных слоў, прыгожых жэстаў – галоўным было сутнаснае, глыбіннае, а не вонкавае ў чалавеку і з'яве. А як занепакоена гаварыў Міхаіл Савіцкі пра тое, што асабліва турбавала:

– Важна не згубіць векавую культуру беларускага народа. Якую кафлю рабілі нашы продкі, а якія кераміка, кавальства, разьба па дрэве, будаўніцтва – найвышэйшы ўзровень! У свеце няма аналагаў слуцкім паясам. Шпалеры ткалі не горшыя, чым у Францыі. У Нясвіжскім замку было каля 50 выдатных габеленаў – Радзівілы іх вывезлі, у нас нічога не засталося. Вось што трэба аднаўляць!

## «Я вельмі нудны чалавек, увесь у рабоце»

**– Міхаіл Андрэевіч, ці хацелася б вярнуць свае 18 гадоў?**

– Не. Слухайце, у мяне дрэнная біяграфія! У 18 гадоў я быў ужо салдатам, потым вайна, палон, канцлагеры… Пасля вайны – вучоба, працаваў з дня ў дзень. Вось і ўсё.

**– Вы кожны дзень прыходзіце ў майстэрню?**

– Так.

**– Акрамя выхадных і святочных дзён?**

– *(Ад душы рассмяяўся.)* Субота, нядзеля – самыя рабочыя дні! Ніхто не перашкаджае, не адцягвае ўвагу ад работы. А найлепш працуецца ў святы.

**– Калі апошні раз былі ў адпачынку?**

– Калі ляжаў у бальніцы.

**– ?!. У вас ёсць прызнанне, слава, усё ёсць… Здаецца, можна даць сабе слабіну, не выкладвацца да донца?**

– Гэта ні ад чаго не залежыць: любімая справа. Самае каштоўнае, што ёсць у чалавека. Выяўленчае мастацтва – надзвычай складаная сфера. Трэба ўсё жыццё імкнуцца стаць Мастаком.

**– Вы сталі Мастаком – згодна з вашымі крытэрыямі?**

– Не, я ўсё яшчэ на шляху да гэтага. Таму і працую ўсё жыццё, без адпачынкаў і выхадных.

Сапраўдны майстар уздымае творчую планку на амаль недасягальную вышыню, няма і не можа быць

месца для самазадаволенасці і самазаспакоенасці. «Калі чыстае палатно паставіш перад сабой – адчуванне такое, што нічога не пісаў, нічога не ўмееш. Нейкая роспач: і што я буду рабіць на гэтым палатне?» – прызнаваўся Савіцкі.

Часта да яго заходзіў знакаміты скульптар, народны мастак Беларусі Леў Мікалаевіч Гумілеўскі. Ён кіраваў акадэмічнай майстэрняй скульптуры. Якія магутныя асобы! І якія цікавыя размовы, абмен думкамі, спрэчкі аб набалелым былі…

## Майстар і Маргарыта

З Маргарытай Захараўнай, жонкай, Савіцкі пазнаёміўся ў час вучобы ў Мінскім мастацкім вучылішчы. Атрымалася амаль па-булгакаўску.

**– Якая ваша жонка, ваша Маргарыта?**

– Ну, якая… Звычайная жанчына.

**– Чаму так непаэтычна – «звычайная»? – прызнаюся, чакала ўзнёсла-прыгожых слоў пра Жанчыну жыцця.**

З сынам Андрэем. Канец 1980-х





Партрэт жонкі мастака, 1994 год

– А хіба я незвычайны?

**– Часта пішаце жонку?**

– Не. Ёсць некалькі партрэтаў. Але, як гаворыцца, шавец без ботаў…

У канцы 1940-х трэба было мець мужнасць выйсці замуж за былога ваеннапалоннага, якога вызвалялі з канцлагера амерыканцы: лёс мог скласціся непрадказальна.

Калі не стала Савіцкага, неаднаразова прасіла Маргарыту Захараўну пагадзіцца на інтэрв'ю. У адказ – катэгарычнае «Не!».

Андрэй Савіцкі, сын знакамітага творцы, таксама быў мастаком. Ён рана пайшоў з жыцця, услед за бацькамі. Прынцыповы. Іранічны. Востры на язык чалавек. Інтэлектуал. Знешне чымсьці падобны да Чэ Гевары. Гэта быў філосаф, эрудыт, публіцыст, палеміст.

Такая немалаважная дэталь. Пра творчасць Міхаіла Савіцкага пісалі многія журналісты, мастацтвазнаўцы, крытыкі. І ўсё ж вазьму на сябе смеласць сцвярджаць, што ніхто не сказаў пра Майстра лепш, чым яго сын. У 1996 годзе выйшаў вялікі альбом «Міхаіл Савіцкі. Жывапіс». Уступны артыкул – а гэта, па сутнасці, надзвычай грунтоўны, глыбока філасофскі мастацтвазнаўчы нарыс – напісаў Андрэй. Па яго просьбе я рэдагавала

вялікі, больш як на 50 старонак, тэкст. Вось кароткі ўрывак, на мове арыгінала.

«Каждый, проживая свою жизнь, соучаствует в бытии всего народа – однако судьбы художников не только становятся в один ряд с судьбой эпохи, но наиболее ясно и полно выражают ее.

Художник познает время своего бытия и творит его – выражает время силой неповторимого искусства. Но точно также само время творит судьбу художника – и личная биография его становится в один ряд с самыми яркими произведениями искусства.

Невозможно разделить – время ли формирует художника, поддается ли искусство давлению судьбы или само лицо времени определяется судьбой поэта или живописца, и искусство, создаваемое художником, определяет судьбу его эпохи».

…Пасля заканчэння тэатральна-мастацкага інстытута Савіцкі-малодшы праходзіў тэрміновую службу ў арміі, спачатку – у чарнобыльскай зоне. Ці не адтуль вытокі знакамітай серыі работ Міхаіла Савіцкага «Чорная Быль»?..

## Скрынка Пандоры

Цыкл работ «Запаведзі» – гэта мастакоўская спроба прасачыць, як запаведзі Хрыста ўвасобіліся ў нашым жыцці. Як і што ажыццявілася з таго, што Хрыстос вызначаў як самае высокае. Міхаіл Андрэевіч тлумачыў:

– Калі запаведзі Маісея датычаць выхавання, дык запаведзі Хрыста – духоўныя: блажэнныя чыстыя сэрцам, блажэнныя міратворцы…

**– А вы блажэнны чалавек?**

– Я?.. Не ведаю, які я чалавек. Звычайны працаўнік. Імкнуся жыць па наказу Божаму, «добывать хлеб в поте лица своего». Удасканальваць сябе маральна і прафесіянальна.

**– Чаму такія няшчасныя твары на вашых палотнах?**

– А вы іх бачыце іншымі?.. Вось у іх – што ў іх *(жэст у бок карціны, дзе адлюстраваны сяляне з хлебам)*? Я ж не пішу багатых зладзеяў, якія абрабавалі народ, а іграюць пры гэтым нейкі спектакль пра «новых беларусаў».

**– Вамі завершана яшчэ адно вялікае палатно – «Адсячэнне галавы Іаана Хрысціцеля». Чаму гэту тэму лічыце актуальнай?**

– Гэта тэма процістаяння – шырэй, чым у рэлігійным сэнсе. Сюжэт, можна сказаць, хрэстаматыйны. Іаан Хрысціцель, будучы чалавекам разумным і не згодным з іудаізмам, прыдумаў новую рэлігію – хрысціянства. Сустрэў вандроўнага філосафа Хрыста, які абгрунтаваў гэту рэлігію. Яна набывала вялікую папулярнасць, і ў народзе пачалося процістаянне прыхільнікаў хрысціянскай рэлігіі і іудаізму. У старадаўнія часы процістаянне завяршылася адсячэннем галавы Іаана Хрысціцеля. І было засведчана: лепш за ўсё адсякаць галаву. Спадабалася. І галовы ляцелі налева і направа на працягу двухтысячагадовай гісторыі… Па-мойму, гэта сучасна: адсячэнне галоў па-ранейшаму застаецца распаўсюджаным сродкам барацьбы з процістаяннем.

Я пачаў работу і на міфалагічны сюжэт – пішу Гермеса і Пандору.

**– Скрынка Пандоры ўжо адчынена?**

– Так. Пандора яе адкрыла… Але, памятаеце, Пандора – зборнае стварэнне. Яе вылепіў Гефест, Афрадыта адарыла яе прыгажосцю, Гермес – кеварствам, хітрасцю і красамоўствам, Афіна – цудоўным адзеннем і г. д. Багі зрабілі злосную істоту ў пакаранне людзям – за ўчынак Праметэя, які выкраў для іх агонь… Гермес адрозніваўся ад іншых багоў. Ён быў ілгун, лаўкач, махляр, дзялок. Бог паведамленняў і гандлю! Менавіта Гермес «падбіў» Пандору адкрыць скрынку, дзе былі ўсе заганы, няшчасці і хваробы. На дне засталася толькі надзея, бо Пандора паспела закрыць накрыўку… І Пандора, і Гермес падобныя да некаторых сучасных людзей – хіба не?

## «У любой глыбінцы можа нарадзіцца новы Скарына…»

У Міхаіла Савіцкага было шмат прыхільнікаў. І разам з тым нямала крытыкаў, нават ганьбавальнікаў. Пасля публікацыі аднаго з інтэрв'ю ў рэдакцыю «Звязды» літаральна праз тыдзень паступіў калектыўны ліст. Ажно 117 подпісаў! Досыць унікальны факт для беларускай журналістыкі найноўшага часу. Помню, не на жарт здзівілася: як за кароткі тэрмін можна сабраць такую вялікую колькасць подпісаў у вузка-элітарным творчым асяроддзі? Публікацыя калектыўнага ліста вылілася ў газетную палеміку.

Даволі катэгарычна выказваўся Міхаіл Савіцкі пра асобныя кірункі сучаснага жывапісу:

– Многае з таго неахайна накіданага фарбай, што цяпер выстаўляецца і з гонарам называецца авангардным мастацтвам (нібыта перадавое), не мае ніякага дачынення да рэчаіснасці. Гэта контркультура, а не мастацтва.

**– Тым не менш авангард таксама мае права на існаванне?**

– Нехта прысвоіў сабе права зрабіць гэтае «мастацтва ідэалагічным і сілай укараняць яго, знішчаючы



Міхаіл Савіцкі і Леў Гумілеўскі з аўтарам артыкула. 2009 год

нацыянальную культуру. Цяпер, калі ты не авангардыст, – значыць наогул не мастак. Адзіная музыка з адным рытмам – для ўсіх народаў, беспрадметны жывапіс – хто на што здатны, толькі не пра жыццё, не пра фарміраванне чалавека маральным, духоўным. Мастацтва дзеля мастацтва? Навошта?..

Сам тэрмін «авангард» мае на ўвазе штосьці новае, перадавое. Аднак «новае» не з'яўляецца эстэтычнай катэгорыяй, гэта проста канстатацыя факта: раней такога не было. Фактар навізны не азначае, добра гэта ці дрэнна, цудоўна ці недарэчна… Твор мастацтва ацэньваецца з пункту гледжання дасканаласці формы, гармоніі, выразнасці. Але нідзе і ніхто з сумленных эстэтыкаў, філосафаў мастацтва ніколі не сказаў: гэты твор добры толькі таму, што ён новы. Сёння адбываецца неверагоднае: паняцце «новае» стала якаснай характарыстыкай. Гэта чыста абывацельскія, спажывецкія адносіны да мастацтва. Бо авангардызм – знішчэнне формы, хоць на словах дэкларуецца пошук новай формы. Суцэльная хлусня!

**– Ваша непрыманне авангарднага мастацтва вядома, здаецца, усім і даўно. Але ж цяпер руйнуюцца ўсе кірункі. Мастацтва, атрымліваецца, непатрэбна нікому – і ніякае?**

– Мы сапраўды знаходзімся ў найвышэйшай фазе каланізацыі, ці проста прагрэсіўнага маразму, калі ніякага мастацтва (як і людзей, што яго ствараюць) наогул не патрабуецца. Авангардысты паскакалі, паламалі, што маглі, а цяпер іх саміх спісалі ва ўтыль. На жаль, з усяго выяўленчага мастацтва застаюцца актуальнымі рэклама замежных фірмаў ды афармленне прыватных рэстаранаў. Вось гэта мастацтва нашых дзён. Іншага мастацтва нам «не паложана», іншага мы не дастойныя – з пункту гледжання фонду Сораса. А той, хто здольны на большае, павінен працаваць не на родную культуру, а на заакіянскую. Хаця… куды кідаць каменне? Іуда – хіба ён здраднік?

**– Безумоўна.**

– Мне здаецца, Іуда – проста слабы чалавек. Нягоднікі – тыя, што далі яму 30 срэбранікаў… Калі Іуда даведаўся пра лёс Хрыста, ён выкінуў грошы і ўдавіўся… Важна заўсёды асэнсоўваць свае дзеянні і ўчынкі.

**– Міхаіл Андрэевіч, магчыма, паўсюдна наступіла паласа «безвременья» – мастацтва наогул няма?**

– Так не бывае! Мастацтва ёсць заўсёды. Проста бывае эпоха «подлее подлого», калі людзі займаюцца мастацтвам на свой страх і рызыку, у жабрацтве, – усё гэта ляжыць пад спудам, яно не запатрабуецца грамадствам. Падобныя перыяды ўжо былі ў гісторыі. Чыноўнік, які рабіў вопіс маёмасці пасля смерці геніяльнага Рэмбранта, запісаў: засталося толькі некалькі пэндзляў і фарбаў, і больш нічога. Для чыноўніка велізарная мастакоўская спадчына – нішто! Рэмбрант быў забыты ў Галандыі на сто гадоў.

Ад таго, што сапраўднае мастацтва ігнаруецца грамадствам, у першую чаргу пакутуе само грамадства. Адбываецца страта інтэлектуальнага цэнзу. Але мастацтва ўсё роўна не перастае існаваць. У любой глыбінцы можа нарадзіцца новы Скарына, Ламаносаў – чалавек, здатны штосьці адметнае стварыць у навуцы, літаратуры, жывапісе, музыцы.

**– Асобныя скептыкі сцвярджаюць, што быццам бы ў нас ніколі і не было сапраўднага мастацтва…**

– Так заявілі некалькі былых дысідэнтаў. Дзіўна, што ўсе з гэтым пагадзіліся, усе маўчаць. Аднак зусім нядаўна свет апладзіраваў усім відам савецкага мастацтва – музыцы, жывапісу, тэатру, харэаграфіі і г. д. Дык куды дзелася гэта, чаму яго аддалі анафеме? Чаму людзі мастацтва вырашылі, што свая праца, свае каштоўнасці нічога не вартыя, а галоўнае – паперкі, што называюцца доларамі? У адносінах да гэтай паперкі, аказваецца, высокакваліфікаваная праца нічога не вартая! Чаму людзі пагадзіліся з гэтым – незразумела. У апошні час адбылася злачынная падмена каштоўнасцей: тое, што на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва лічылася злом, цяпер успрымаецца як дабро, тады як дабро ўяўляецца нейкай непатрэбнай рэччу. Неабходна аднавіць іерархію каштоўнасцей грамадства. Самыя вялікія каштоўнасці, безумоўна, духоўна-маральныя… Мастацтва павінна дапамагчы: гэта адно з самых магутных сродкаў работы з чалавекам, бо яно можа працаваць адначасова і з цэлым народам, і з кожным паасобку. Адкідваць гэту сілу неразумна.

## XX век. Забойства праўды

Так называецца апошняя работа, якую выканаў Міхаіл Савіцкі ў мінулым стагоддзі. Гэта своеасаблівы роздум мастака над перыядам часу, у якім прайшла пераважная частка яго жыцця.

**– Як вы думаеце, што будзе з праўдай у XXI стагоддзі?**

– У пачатку стагоддзя «забойствы праўды» яшчэ больш актывізаваліся. Урэшце ўсё залежыць ад таго, як складуцца суадносіны паміж дабром і злом. Сёння зло заяўляе пра сябе ўпэўнена і гучна. І самае страшнае, што яно нярэдка пераапранаецца ў адзенне дабра. Ужо можна назіраць панаванне вытанчанай хлусні. Вы, як супрацоўнік сродкаў масавай інфармацыі, няблага гэта ведаеце. Ні для каго не сакрэт, што адзін і той жа факт можна паднесці ў рознай інтэрпрэтацыі, афарбоўцы, накіраванасці. Пэўныя сілы, у тым ліку і праз дакладна і тонка вызначаную інфармацыйную палітыку, праводзяць і насаджаюць ідэалы, вельмі далёкія ад спрадвечных ідэалаў і каштоўнасцей беларускага народа. Спадзяюся, у XXI стагоддзі гэтыя цёмныя сілы хоць і няхутка, але непазбежна і абавязкова будуць выкрыты і зняслаўлены.

**– У Пушкіна Сальеры сцвярджае: «Все говорят: нет правды на земле. Но правды нет – и выше…» У кожнага чалавека свая жыццёвая праўда. Але дзе шукаць ісціну, Міхаіл Андрэевіч?**

– Ведаеце, ісціна – такая рэч, якая не патрабуе доказаў. Ісцін шмат… Магчыма, надта гучна сказана, але для мяне аксіёма – сапраўдны твор мастацтва з'яўляецца ісцінай, яго нельга абвергнуць.

**– Але ж абвяргаюць!**

– Не. Крытыкуюць, але не абвяргаюць. Знаходзяць любыя формы: маўляў, ён такі чалавек сам па сабе, ён састарэў, а цяпер ужо новае, сучаснае. Але як ісціну абвергнуць мае работы «крытыкі» не могуць.

Напрыклад, мая «Партызанская Мадонна» – таксама ісціна. Я пісаў гэту работу пра Беларусь, галоўная ідэя – жыццё (яно было разнастайным у час вайны) мацнейшае за вайну. Гэта ісціна. А мяне судзілі за «Партызанскую Мадонну» таварыскім судом. Аднак яе не абверглі!

**– Судзілі?!.**

– Так. Саюз мастакоў – таварыскім судом. Розныя абвінавачанні гучалі. Сцвярджалі, што гэта рэлігійная работа: савецкі час, татальны атэізм – і раптам прапаганда рэлігіі. На што я запярэчыў, што нават у перакладзе слова «мадонна» азначае: «ма» – мая, «донна» – жанчына. Што тут рэлігійнага?.. Падключыліся некаторыя партызаны: маўляў, у партызанах ніхто не нараджаў, усе ваявалі. Атрымліваецца, я зневажаю партызанаў, наношу шкоду партызанскаму руху… На тым сходзе, памятаю, сказаў: вы судзі́це, а я пайшоў. Гэта выклікала неверагоднае абурэнне: якая непавага да суда і г. д. А я і сапраўды пайшоў з гэтага судзілішча.

У пасляваенны час мяне, былога вязня, адкрыта называлі ворагам савецкай улады. Партыйныя сходы пісалі рэзалюцыі: ідэалагічны дыверсант, у архівах ляжаць гэтыя тамы… А цяпер некаторыя пішуць, нібыта я пры камуністах працвітаў! У застой крытыкавалі за адступленне ад сацрэалізму. За нячленства ў КПСС. За тое, што Ленін напісаны няправільна – «очерняюще»; не так, якім павінен быць правадыр на карціне. Сёння крытыкуюць тыя самыя людзі, толькі цяпер ужо – што насаджаў сацрэалізм і быў правадніком ідэй кампартыі. Як вам гэта падабаецца?!.

**– Ваша «Партызанская Мадонна», калі не памыляюся, захоўваецца ў Траццякоўскай галерэі?**

– Так. І яна лічыцца адным з шэдэўраў Траццякоўкі – ва ўсякім разе, так пішуць маскоўскія крытыкі. Больш за тое, пры адкрыцці помніка на Паклоннай гары ў гонар Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў музеі на цэнтральнай сцяне змясцілі толькі маю «Партызанскую Мадонну» – іншых работ не было.

**– У вас ёсць і «Партызанская Мадонна Мінская»…**

– Гэту работу я напісаў праз 11 гадоў дзякуючы неадступнай просьбе Алены Васільеўны Аладавай – колішняга дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея. Гэта жанчына была сапраўдным падзвіжнікам!

**– У вас заўсёды мноства ідэй, задум…**

– Я маю намер, калі паспею, напісаць вельмі злосную работу – «Трыумф ілжы».

## «Толькі мастацтву дадзена сіла падоўжыць жыццё»

**– Пытанні, якія задаваў сабе і кожнаму Імануіл Кант: што я магу ведаць? што я павінен рабіць? на што я магу спадзявацца? Як вы адказалі б на іх?**

– Хачу ведаць яшчэ вельмі многа, асабліва пра шляхі развіцця мастацтва будучыні. Аб гэтым у сваіх працах пісалі многія рускія мысліцелі. Варта было б як след прааналізаваць Гумілёва, Сарокіна, іншых выдатных філосафаў і мастацтвазнаўцаў: цяпер адбываюцца змены ў культуры. Пэўныя сілы паставілі задачу знішчэння нацыянальных культур. Ідзе так званая глабалізацыя, мы ўсе відавочцы гэтага працэсу.

Што я павінен рабіць? Шмат цікавых задум. Ці паспею, ці змагу іх ажыццявіць?..

На што спадзявацца? Я ўжо стары, каб нечага жадаць, узрошчваць надзею. Спадзявацца магу толькі на сябе.

**– Міхаіл Андрэевіч, для мастака ўзрост – гэта дабро ці зло?**

– Для мастака, як і для кожнага чалавека, узрост – з’ява непазбежная. Але ёсць, канешне, пэўнае шкадаванне. Таму што жыццё было складанае – біяграфію маю вы ведаеце. Здароўе зусім не тое, што патрабуецца мастаку. А творчых задум – грунтоўных, з дакладным глыбокім аналізам – больш чым у маладыя гады. І я не змагу іх рэалізаваць… Так уладкаваны свет: усё жыве пэўны тэрмін. І толькі мастацтву дадзена сіла падоўжыць жыццё.

**ХХ век. Забойства праўды. 1994–1998 гады**



## Скобраўка-1944

Апошняя вялікая работа, над якой працаваў Міхаіл Савіцкі, была задумана, каб адкрыць яшчэ адну жорсткую праўду Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі. Праўду, якую не ўсе ведаюць і пра якую чамусьці доўгі час маўчалі.

Мастак расказваў:

– У цыкле «Лічбы на сэрцы» я стараўся паказаць праз канцлагеры сутнасць расізму. Але адзін канцлагер, дзе бралі кроў у дзяцей, нідзе афіцыйна не існаваў. Быў неверагодна ўражаны, што ў Мінскай вобласці, каля Мар’інай Горкі, у Скобраўцы, быў лагер, праз які прайшлі больш як тры тысячы дзяцей. Гіганцкі лагер, дзе забіралі ў дзетак кроў. Ужо тады ў мяне ўзнікла думка пра тое, што абавязкова трэба гучна сказаць аб гэтым найвялікшым злачынстве. Асабіста я расцэньваю яго як яшчэ больш страшнае, чым злачынства Ірада, які забіваў дзяцей. Гэта злачынства на многія вякі ўвайшло ў гісторыю, нават у Бібліі зафіксавана. А злачынства ў Скобраўцы не ідзе ў параўнанне з іншымі. Дзяцей, якія не вытрымлівалі, пасля трох збораў крыві пaмiралі, – іх проста закопвалі…

Найвялікшае злачынства ў Скобраўцы павінна прагучаць гэтак жа, як біблейскае. Як злачынствы ў Лідзіцы, у Герніцы (у Пікасо ёсць плакатная работа «Герніка»)… Цяпер іншы час. І ён таксама патрабуе ўжо сённяшнім днём асэнсаваць гэтую з’яву… Людзі, якія ведалі пра вызваленне лагера, паведамлялі па акрузе, усе беглі туды,







**Міхаіл Савіцкі вельмі сур'ёзна ставіўся да карціны «Скобраўка-1944», шмат разоў перарабляў яе**



**У Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага захоўваецца апошні варыянт**

у Скобраўку, бо хацелі хутчэй даведацца, ці жывыя іх дзеці. Вызваленне – гэта адна сюжэтная лінія. Бацькі адкопваюць дзетак-нябожчыкаў – другая. А дзеткі, якія яшчэ жывыя, але надта знясіленыя, не могуць устаць, іх выносяць, аказваюць дапамогу – гэта ўжо трэцяя… Была неабходнасць звярнуцца да класічнай кампазіцыі, гэта значыць кампазіцыі ранняга хрысціянства. Яна адна была – што ў выяўленчым мастацтве, што ў драматургіі – ідовішчная. У драматургіі паслядоўна ідуць акты, вось і я ўзяўся за «актавую» кампазіцыю. Акты «Вызваленне», «Зняцце» (як Хрыста – выносяць хлопчыка), «Аплакванне»… Мне абавязкова трэба паспець напісаць. Не «загнуцца»…

Савіцкі вельмі сур'ёзна ставіўся да гэтай работы. Шмат разоў перарабляў. Замазваў… Нават на маіх фотаздымках жніўня 2008 года і верасня 2009-га карціны вельмі адрозніваюцца. У Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага – іншы варыянт.

Мастак так і не паспеў завяршыць сваю «Скобраўку»…

***Таццяна ПАДАЛЯК,***
***доктар філалагічных навук,***
***прафесар кафедры медыялогіі***
***факультэта журналістыкі БДУ, дацэнт***
***Фота аўтара, БЕЛТА і з адкрытых крыніц***